# Указ

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

30 снежня 2022 г. № 452 г.Мінск

Аб прысуджэнні прэміі Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь

1. За актыўную дзейнасць у гуманітарнай галіне, што садзейнічае захаванню і памнажэнню нацыянальнага культурнага здабытку, выхаванню ў моладзі любові да Айчыны, умацаванню духоўных каштоўнасцей і ідэй міласэрнасці, прысудзіць прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”За духоўнае адраджэнне“ 2022 года:

аўтарскаму калектыву ў складзе Баранчука Васілія Анатольевіча, дырэктара Духоўна-асветніцкага цэнтра прыхода храма ў гонар прападобнамучаніцы вялікай княгіні Елісаветы ў г.Бабруйску, протаіерэя Толаха Віктара Уладзіміравіча, настаяцеля прыхода храма ў гонар прападобнамучаніцы вялікай княгіні Елісаветы ў г.Бабруйску, – за вялікі ўклад ва ўмацаванне духоўных каштоўнасцей, культурнае і маральнае выхаванне дзяцей і моладзі;

ваенна-патрыятычнаму клубу ”Рысь“ вайсковай часці 3214 унутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў – за актыўную дзейнасць па ваенна-патрыятычным выхаванні падлеткаў;

калектыву дзяржаўнай навуковай установы ”Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі“ – за значны ўклад у выхаванне любові да Айчыны, даследаванні гісторыка-культурнай спадчыны, выпуск навуковага энцыклапедычнага выдання ”Гарады і вёскі Беларусі“;

рэспубліканскаму грамадскаму аб’яднанню ”Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжа“ – за актыўную дзейнасць у гуманітарнай галіне, значны ўклад у аказанне дабрачыннай дапамогі і развіццё валанцёрскага руху.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”За духоўнае адраджэнне“ 2022 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад абкладання падаходным падаткам з фізічных асоб.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь — А.Лукашэнка

АДМИНИСТРАЦИЯ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
Для правовых актов
* 2 *

10